**Краўцова Аляксандра, 41 група**

# УВАСАБЛЕННЕ ІНФЕРНАЛЬНАЙ ТЭМЫ Ў П'ЕСЕ Ф. АЛЯХНОВІЧА "КРУЦІ НЕ КРУЦІ – ТРЭБА ПАМЯРЦІ"

*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

У літаратуразнаўстве пад *інфернальнымі* (з латыні – "падземны", "ніжні") разумеюць матывы наведвання пекла, сустрэчы героя з замагільным светам і яго жыхарамі. У еўрапейскім слоўным мастацтве падобнымі матывамі прасякнуты літаратурныя шэдэўры розных эпох. Інфернальная праблематыка і вобразнасць шырока прадстаўлены ў беларускім прыгожым пісьменстве, у тым ліку ў п'есе "Круці не круці – трэба памярці" (1943) выдатнага драматурга XX стагоддзя Ф. Аляхновіча.

Шасціактавая п'еса з пралогам "Круці не круці – трэба памярці" стала апошнім сцэнічным творам Ф. Аляхновіча. Напісаны вершаванай прозай твор, у якім адмысловым чынам спалучыліся фальклорна-фантастычныя матывы з фактамі сучаснай драматургу рэчаіснасці, працягвае нацыянальныя фальклорныя і літаратурныя традыцыі ў асваенні інфернальнай тэмы.

Неабходнасць звароту да фальклорнай тэматыкі Ф. Аляхновіч адчуў у той час, калі на Беларусі панавалі хаос і тэрор, калі вера ў розум чалавека ставілася пад пытанне. У гэты момант гісторыі пісьменнік намагаўся паглыбіцца ў сутнасць сучаснасці, знайсці тыповыя прыкметы эпохі, прыхаваныя прычынна-выніковыя сувязі. Так узнік твор-роздум на тэму жыцця не толькі свайго народа, але і ўсяго чалавецтва, які ў сваім філасофскім падтэксце выступаў супраць усялякага прыгнёту.

Ужо аўтарская фармуліроўка "сцэнічны гратэск" несла ў сабе пэўную праграму, вандроўны сюжэт п'есы прадвызначыў мастацкія сродкі выяўленння цэнтральнай ідэі. Драматург свядома накіроўваў даследаванне эпохі ва ўмоўна-фантастычнае рэчышча, што для часоў нямецкай акупацыі і папярэдняй ім сталінскай эпохі было зусім заканамерна.

Дзеянне п'есы разгортваецца ў Вільні і наваколлі, час маркіраваны як эпоха Сярэднявечча, аднак па асобных штрыхах-дэталях чытач беспамылкова пазнае сучасную драматургу рэчаіснасць. Можна гаварыць пра ўніверсальнасць і пазачасавасць зместу твора – падзеі і праблемы, якія асэнсоўваюцца ў п'есе, актуальныя для любой краіны і любой эпохі.

Як і ў "Камедыі" К. Марашэўскага, аднаго з пачынальнікаў інфернальнай тэмы ў нашай літаратуры, у творы Ф. Аляхновіча персанажы пазбаўлены індывідуалізацыі, выступаюць як абагуленыя тыпы. У п'есе дзейнічаюць мужык, алхімік, старая ведзьма, маладая ведзьма, першы чорт, другі чорт, першы шляхціц, другі шляхціц, поп, ксёндз, яўрэй, татарын і інш. Драматург працягвае казачна-фальклорную традыцыю, што актуалізуе ўмоўна-фантастычны складнік твора, разам з тым ў п'есе вельмі моцны рэалістычны пачатак, адчувальныя адсылкі да асоб і падзей XX стагоддзя.

Сустрэча мужыка са смерцю выглядае натуральнай, не выклікае здзіўлення ні ў персанажа, ні ў чытача: *"Ах, вось і яна! Вось мой канец!.. Яснавяльможная паня Кастуся! Змілуйся нада мной! Дай мне яшчэ крыху*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*пажыць! <…> Я ўжо здароў, як рыба, ха-ха-ха!”* [1, с. 154]. У смерці ў адрозненне ад большасці іншых герояў нават ёсць уласнае імя – Кастуся. Ужытае ў памяншальна-ласкальнай форме, яно нівеліруе страшную сутнасць смерці, пераводзіць яе ў разрад звычайнага, паўсядзённага.

Стомленая кабета смерць просіць мужыка занесці яе ў горад: *“Замарылася, накасілася, што ледзь на нагах стаю, – сама да Вільні не дайду. <…> Дык занясі, браток, мяне ў Вільню на сваёй спіне”* [1, с. 155]. У якасці аплаты за паслугу яна дае магчымасць даведацца пра сваю будучыню: *“Я не грашмі табе плачу, бо праўда, што я не багата, але табе цяпер хачу даць лепшую яшчэ заплату: магчымасць я табе даю ў прышласць заглянуць сваю…”* [1, с. 156].

Падобна Дзіда-дзеду з казкі З. Бядулі “Сярэбраная табакерка” мужык падманвае смерць і перадае алхіміку. Смерць, такім чынам, аказваецца паланёнай, а жыццю нічога не пагражае. Аднак знаходзіцца шмат людзей (далакоп, сталяр, ксёндз, поп і інш.), якія не задаволеныя гэтай падзеяй. Іх лозунг *“За Смерць жыцця не пашкадуем!”* сугучны думкам бядулеўскіх антыгерояў. Драматург сцірае межы паміж дабром і злом, фіксуе тую каштоўную нявызначанасць, якая ўзнікае са стратай чалавекам маральных арыенціраў. Ф. Аляхновіч выступае з тэзісам, што ў жыцці людзі часта аддаюць перавагу не розуму, а мімалётным памкненням і жаданням.

Такім чынам, інтэрпрэтацыя інфернальнай праблемы Ф. Аляхновічам палягае ў рамках беларускай літаратурнай традыцыі. Паказальна, што твор на тэму супрацьстаяння жыцця і смерці стаў апошнім у набытку пісьменніка. Сёння гэта п’еса ўспрымаецца як твор-прадчуванне аўтарам свайго хуткага сыходу вясною 1944 г.

Мастацкае даследаванне інфернальнай праблематыкі кожным пісьменнікам ажыццяўляецца па-свойму і залежыць ад розных фактараў: творчай ідэі, якую аўтар імкнецца ўвасобіць у тэксце; пісьменніцкага тэмпераменту; часу і ўмоў напісання літаратурнага твора. Калі ў аповесці-казцы “Сярэбраная табакерка” З. Бядулі ўвасоблены традыцыйны для еўрапейскага фальклору матыў змагання са смерцю, то ў п’есе “Круці не круці – трэба памярці” Ф. Аляхновіча пастаўлена праблема жыцця народа і ўсяго чалавецтва ў складанай гістарычнай сітуацыі.

Літаратура

1. Аляхновіч, Ф. Выбраныя творы / Ф. Аляхновіч; уклад., прадм. А. Сабалеўскага; камент. Г. Кажамякіна і А. Сабалеўскага. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2005. – 544 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ